распалубкамі на падпружных арках, бакавыя нефы — крыжовымі скляпеннямі. У інтэр'еры захоўваюцца каштоўныя абразы 18 – 19 стст.

У 1910-1911 гг. на ахвяраванні парафіян пабудаваны касцёл Узнясення св. Крыжа, своеасаблівая эклектычная архітэктура якога спалучае рысы неараманскага стылю і неаготыкі. Архітэктанічна – гэта класічная трохнефавая крыжовая базіліка, змураваная з жоўтай цэглы, якая атрымала пашырэнне ў будаўніцтве Беларусі на мяжы 19 – 20 стст. Касцёл Узнясення Святога Крыжа ў г. Астравец пабудаваны на каталіцкім цвінтары (вул. Ленінская, 7). Урачыста ўзняты на пагорак і высокі цокаль, выкладзены магутнымі вапняковымі квадрамі. Выкарыстоўваўся як гандлёвы склад. Зноў адкрыты ў 1994 г. Ля касцела быў пахаваны першы рускі консул у Японіі І.А. Гашкевіч (1814 – 1872; магіла не захавалася).

Ва ўсёй сукупнасці вытокаў і праяў касцельная архітэктура Беларусі — агульнанацыянальны гісторыка-культурны і турыстычны здабытак. Гэтыя хрысціянскія святыні арганічна ўвайшлі ў архітэктурнае і прыроднае асяроддзе краіны, сваімі манументальнымі гмахамі, вежамі, ўключыліся ў структуру гарадоў і вёсак Беларусі, фарміруючы іх маляўнічыя панарамы і сілуэты. Яны стаяць на беларускай зямлі, будаваліся ў яе гістарычным і культурным асяроддзі і з цягам часу зрасліся з гэтым асяроддзем. Дзейнасць заходняй хрысціянскай царквы пакінула ў нашай культуры прыкметны след, і ў першую чаргу гэта архітэктурныя помнікі, некаторыя з якіх лічацца агульнаеўрапейскімі шэдэўрамі, якія проста неабходна разглядаць, як турыстычны патэнцыял раёна.

Тэма комплекснага даследвання архітэктурнай спадчыны Астравецкага раёна як турыстычнага здабытка і надалей застаецца перспектыўнай для архітэктурнага і гісторыка-культурнага вывучэння.

ЛІТАРАТУРА

1. Усціменка, І.Р. Міхалішкаўскі кляштар Аўгустынцаў / І.Р. Усціменка // Аставецкая праўда. – 2004.
2. Быстрыца і яе жыхары [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.ostrovets.by/?p=2160. – Дата доступу: 09.09.2015 г.
3. Памяць. Астравецкі раён. – Мінск : Белар. энцыкл., 2004. – 480 с.
4. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі (Гродзенская вобласць). – Мінск : Белар. сов. энцыкл. імя Пятруся Броўкі, 1986. – Стар. 88.

**УДК 72.05:296.735(476.6)**

## ПОМНІКІ ДРАЎЛЯНАГА ДОЙЛІДСТВА АСТРАВЕЦКАГА РАЁНА Ў ТУРЫСЦКА-ЭКСКУРСІЙНЫМ ПАКАЗЕ

***М.К. ШАЎЛІС***
***(Прадстаўлена: І.У. ВАТКІНС)***

Рэспубліка Беларусь – дзяржава з багатай старажытнай гісторыяй, размешчаная ў цэнтры еўрапейскага кантынента на скрыжаванні гандлёвых шляхоў. Нягледзячы на існуючы турысцкі патэнцыял, сучасны стан сферы турызму ў Рэспубліцы Беларусь не займае належнага становішча ў эканоміцы краіны.

У сілу свайго геапалітычнага становішча тэрыторыя Беларусі часта станавілася арэнай ваенных дзеянняў, што абумовіла адносна невысокую ступень захавання гісторыка-архітэктурных помнікаў. Тым не менш рэспубліка мае багаты гісторыка-культурны патэнцыял, які сфармаваўся на працягу тысячагадовай гісторыі станаўлення беларускай дзяржаўнасці. На тэрыторыі Беларусі налічваецца звыш 17,5 тыс. помнікаў гісторыі і культуры, з ліку якіх больш за 2,5 тыс. аб'ектаў маюць нацыянальнае значэнне.

Зыходзячы з рэгіянальных адрозненняў рэкрэацыйна-рэсурснага патэнцыялу, турысцкай спецыялізацыі і ўзроўню развіцця рэкрэацыйных функцый, вылучаюць чатыры асноўныя рэкрэацыйна-турысцкія раёны Беларусі: Паўночны (Віцебская вобл.), Цэнтральны (Мінская вобл., Ашмянскі, Астравецкі, Смаргонскі раёны Гродзенскай вобл.), Заходні (Брэсцкая і асноўная частка Гродзенскай вобл.) і Усходні (Гомельская і Магілёўская вобл.).

Цэнтральны раён валодае найбольш развітай турысцкай інфраструктурай і канцэнтруе звыш 2/5 курортна-рэкрэацыйных устаноў і каля 1/3 рэкрэацыйных тэрыторый. Спецыялізацыя раёна вызначаецца арганізацыяй аздараўленча-турыстычнага, курортна-лячэбнага (курорты Нарач і Ждановічы) і экскурсійнага абслугоўвання.

Выгаднае транспартна-геаграфічнае становішча Астравецкага раёна спрыяе развіццю транзітнага турызму і прыгранічнага турысцкага абмену з Польшчай і Літвой. Прыродныя комплексы і гісторыка-культурная спадчына Беларусі дазваляюць распрацаваць разнастайныя турысцкія маршруты, якія

ўключаюць розныя віды тураў для наведвальнікаў: экалагічныя, этнічныя, паляўнічыя, сельскія, праграмы кароткачасовага абслугоўвання транзітных наведвальнікаў, спецыялізаваныя праграмы. Адным з такіх тураў з’яўляецца спецыялізаваны турыстычны маршрут “Помнікі драўлянага сакральнага дойлідства Астравецкага раёна” (мал. 1), які дазваляе пазнаёміцца з гісторыяй вёсак і храмаў Астравеччыны, падрабязна разгледзець асаблівасці архітэктуры і ўнутранае скульптурна-дэкаратыўнае аздабленне храмаў.




Мал. 1. Схема спецыялізаванага турыстычнага маршруту “Помнікі драўлянага сакральнага дойлідства Астравецкага раёна”:

А – касцёл Звеставання Панне Марыі ў в. Гудагай; В – касцёл Беззаганнага Зачацця Дзевы Марыі, св. Войцеха і св. пакутнікаў у в. Жукойнях-Жэлядскіх; С – Юр’еўскі касцёл у в. Вялікія Свіранкі; D – Касцёл Нараджэння Панны Марыі ў в. Кемелішкі; Е – касцёл св. Яўхіма ў в. Клюшчаны; F – касцёл св. Андрэя Баболі ў в. Градаўшчызна; G – капліца ў в. Гіры; Н – касцёл Апекі Маці Божай у в. Дайлідкі

Велічныя храмы, манументальныя фрэскі і творы іканапісу — бясцэнная культурная спадчына народа. У творах архітэктуры ўвасабляецца непаўторнасць светаўспрымання, талент і міралюбнасць народа. Храмы мацуюць сувязь часоў, дапамагаюць асэнсоўваць перажытае. Што можа больш дакладна вызначыць каштоўнасці кожнай культурнай эпохі, як не помнікі сакральнай архітэктуры! А калі адасобіцца ад сакральнасці — ці гэта не ўвасабленне тытанічнай інтэлектуальнай і фізічнай працы, найтанчэйшых разлікаў, канцэнтрацыі ўсіх творчых магчымасцей народа ва ўсіх відах мастацтва.

Акрамя мураваных культавых збудаванняў на Астравеччыне ацалела некалькі каштоўных помнікаў драўлянага сакральнага дойлідства. Відавочна, што ўсе ацалелыя на сённяшні дзень помнікі драўлянага культавага дойлідства Астравеччыны маюць агульныя рысы ў аб’ёмна-прасторавай кампазіцыі і вызначаюцца сціплым дэкаратыўным вырашэнні. Першапачаткова яны былі ўзведзены ў эпоху барока, потым былі рэканструяваны ці адноўлены на старых падмурках і набылі прыкметы новых архітэктурна-мастацкіх стыляў, але трывала захоўвалі традыцыі мясцовага цяслярства паўночнага захаду Беларусі.

Найбольш старажытным помнікам драўлянага дойлідства з’яўляецца касцёл Звеставання Панне Марыі ў вёсцы Гудагай, вядомай з канца XVI ст. як уладанне Урбаноўскіх, Скірмунтаў, Садоўскіх, Козел-Паклеўскіх, Разводоўскіх, Войнаў. Архітэктанічна і прапарцыянальна гудагайскі касцёл імітуе ў дрэве формы мураваных каталіцкіх святыняў позняга барока. Выцягнуты прамавугольны аб’ём і роўная з ім пяціграння апсіда прэзбітэрыя аб’яднаны двухсхільным дахам з вальмамі над алтаром і застрэшкамі ў месцы злучэння зрубаў. Па баках прэзбітэрыя размешчаны невысокія квадратныя ў плане закрыстыі. Галоўны фасад па вуглах асноўнага аб’ёма фланкуюць дзве чацверыковыя вежы, якія раней завяршаліся яшчэ адным ярусам чацверыкоў з фігурнымі барочнымі купалкамі. Пасля рэканструкцыі галоўны фасад завершаны класіцыстычным трохвугольным франтонам з гарызантальнай ашалёўкай і вастраверхай сігнатуркай. У касцёле ёсць унутраны нартэкс, над якім на двух слупах размешчаны вялікія арганныя хоры, і экзанартэкс – невысокі вонкавы бабінец-крухта. Прасторны інтэр’ер касцёла перакрыты плоскай падшыўной столлю. Сцены ашаляваныя гарызантальна з вертыкальнай панеллю ўнізе. Тры прысценныя архітэктанічныя алтары і арган выкананы ў стылі барочнага класіцызму, белыя з пазалотай, з

элементамі ракайльнай аздобы. Двух’ярусныя бакавыя алтары св. Казіміра і Сэрца Езуса пастаўлены пад вуглам да сценаў асноўнага аб’ёма, што надае інтэр’еру барочную дынаміку, стварае эфект перацякання прасторы. У цэнтры трох’яруснага галоўнага алтара змяшчаўся мясцовы цудадзейны абраз Маці Божай Шкаплернай, апякункі кармэлітаў. [1]

Шкаплер – падоўжны кавалак тканіны з выразам для надзявання праз галаву, які манахі надзявалі паверх габіта. Паводле старажытнага падання, генерал ордэна кармэлітаў Сымон атрымаў шкаплер ад самой Маці Божай. З гісторыяй кармэліцкага ордэна і шанаваннем Маці Божай Шкаплернай звязана складаная гісторыя існавання касцёла ў Жукойнях-Жэлядскіх ці Жэлядзях. [2] Тут кармэліты босыя аселі вельмі даўно, пасля таго як сакратар караля Жыгімонта III Вазы ў 1621 г. падараваў гэты маёнтак віленскаму кляштару ордэна пры касцёле Усіх Святых. Драўляны касцёл у гонар Беззаганнага Зачацця Дзевы Марыі, св. Войцеха і св. пакутнікаў быў пабудаваны ў Жалядзях ужо ў 1622 г. У комплекс кляштара з цягам часу ўвайшлі таксама жылы манастырскі будынак са склепам, школа, шпіталь і багадзельня для нямоглых і старых, сад з лекавымі раслінамі, сажалка для развядзення рыбы і жыватворная крыніца.

У XVIII ст. кармэліты меркавалі пабудаваць мураваны касцёл замест драўлянага, але не паспелі. Ужо ў межах Расійскай імперыі, у 1820 г., стары касцёл быў заменены на новы драўляны, большых памераў, але ў 1842 г. кляштар быў зачынены, а касцёл пераведзены ў парафіяльны. У 1866 г. касцёл быў зачынены за ўдзел парафіянаў у паўстанні 1863–1864 гг. і перароблены пад праваслаўную царкву, якая згарэла ў 1904 г. Да 1912 г. на гэтым месцы ўзвялі невялікую мураваную царкву, якую ў 1914–1918 гг. рэканструявалі пад касцёл, асвечаны ў гонар Маці Божай Шкаплернай, пры гэтым змянілі арыентацыю алтара на захад. Памяшканне царквы стала прэзбітэрыем, да якога прыбудавалі асноўны зруб-трысцен з арачнымі вокнамі, а над уваходам усталявалі хоры з фісгармоніяй. Касцёл дзейнічаў да 1948 г., у 1990 г. ён быў вернуты каталікам і рэкансэкраваны, атынкаваны сцены і прыбудавана вежачка-сігнатурка на галоўным фасадзе.

Архітэктурнае вырашэнне гудагайскага касцёла амаль цалкам паўтарае яшчэ адзін помнік драўлянага сакральнага дойлідства Астравеччыны – Юр’еўскі касцёл у вёсцы Вялікія Свіранкі (мал. 2). У 1671 г. за кошт віленскага капітула тут быў заснаваны драўляны касцёл, а ў 1690 г. пры ім збудаваны драўляны кляштар місіянераў. Паводле архітэктурна-мастацкіх характарыстык Юр’еўскі касцёл пабудаваны, як і гудагайскі, у канцы XVIII ст., а ў пачатку XX ст. рэканструяваны. Асноўны прамавугольны ў плане аб’ём і пяцігранная апсіда прэзбітэрыя накрыты агульным двухсхільным дахам з вальмамі над алтаром і застрэшкамі ў месцы злучэння зрубаў. А ў адрозненне ад гудагайскага касцёла, закрыстыі тут маюць розныя памеры. З боку галоўнага фасада вільчык даха прарэзвае невялікая васьміграння вежачка, завершаная шатром. Асноўны аб’ём па баках галоўнага фасада фланкаваны чацверыковымі вежамі, заяршэнні якіх не захаваліся. Тарэц даха закрыты трохвугольным франтонам, раскрапаваным над вежамі. Невысокі ўваходны бабінец (экзанартэкс) таксама накрыты двухсхільным дахам з трохвугольным франтонам, схілы якога адпавядаюць асноўнаму франтону. Уваходныя дзверы аформлены адмысловай дэкаратыўнай шалёўкай. [3]



Мал. 2. Касцёл святога Юрыя ў вёсцы Вялікія Свіранкі

Сцены Юр’еўскага касцёла ашаляваны гарызантальна з вертыкальнай цокальнай панеллю і ўмацаваны вертыкальнымі сцяжкамі. Вокны маюць лучковыя завяршэнні. Унутры сцены таксама ашаляваныя, унізе ўпрыгожаныя філёнгавымі нішамі, расчлянёныя пілястрамі і завершаныя цягай карніза. Столь плоская на падугах. Над нартэксам размешчаны арганныя хоры. Усе гэтыя дэталі маюць рысы барочнага класіцызму і сведчаць пра больш раннюю дату будаўніцтва Велікасвіранскага касцёла, чым 2-я палова XIX ст. [4] У 1910 г. каля касцёла была змуравана двух’ярусная чацверыковая званіца,

накрытая шатровым дахам. Глухі ніжні ярус складзены з бутавых камянёў, верхні ярус змураваны з цэглы і прарэзаны з кожнага боку двума высокімі паўцыркульнымі праёмамі.

У 1781 г. Станіславам Прушчыньскім быў фундаваны драўляны касцёл у вёсцы Кемелішкі, асвечаны ў гонар Нараджэння Панны Марыі біскупам Д. Пілхоўскім у 1799 г. У 1866 – 1889 гг. пробашчам гэтага касцёла служыў вядомы рэлігійны дзеяч Я. Курчэўскі. Касцёл, перабудаваны ў 1900 г., з'яўляецца цікавым узорам інтэрпрэтацыі элементаў неаготыкі ў драўляным дойлідстве. Будынак імітуе мураваную трохнававую базыліку з трансептам і дзвюма чацверыковымі вежамі на галоўным фасадзе. Верхнія васьміgranныя ярусы вежаў завершаны вастраверхімі шатрамі, аздобленымі франтончыкамі-вімпергамі па баках свету. Двухсхільны дах трансепта больш нізкі за асноўны і адпавядае па вышыні такому ж даху над уваходным чатырохкалонным ганкам.

Нарастанне вышыняў дахаў, рамантычныя завяршэнні вежаў надаюць маляўнічасць і разнастайнасць аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі і дэкаратыўнаму вырашэнню збудавання. Вокны маюць лучковыя завяршэнні, на тарцах трансепта – рамбічныя люнеты. [5] Сцены ашаляваныя гарызантальна, з цокальнай панеллю, і ўмацаваныя сцяжкамі. Інтэр'ер падзелены шасцю слупамі на тры навы, пры ўваходзе вылучаны нартэкс. На поўдзень ад касцёла размешчаны трохпралётная мураваная брама і драўляная трох'ярусная чацверыковая званіца, накрытая чатырохсхільным шатром-«каўпаком» з вастраверхай сігнатуркай.



Мал. 3. Касцёл св. Яўхіма ў вёсцы Клюшчаны

Рысы несапраўднай готыкі мае таксама касцёл св. Яўхіма ў вёсцы Клюшчаны (мал. 3), фундаваны Янам Корсакам у 1786 г., і рэканструяваны на ахвяраванні парафіянаў у 1887 г. Гэта прамавугольнае ў плане збудаванне з роўнавысокай пяціграннай алтарнай апсідай і сіметрычнымі закрыстыямі па баках. Галоўны фасад завершаны трохвугольным франтонам і чацверыковымі вежамі з высокімі шатрамі і вімпергамі па баках свету. Пры ўваходзе – невысокі бабінец з двухсхільным дахам. Сцены будынка ашаляваныя вертыкальна і ўмацаваныя сцяжкамі. Ашалёўка галоўнага фасада пры рэканструкцыі заменена на гарызантальную і аздоблена салярнымі матывамі. [6] Інтэр'ер падзелены 4 слупамі. Уваходная брама, пастаўленая па восі касцёла, вырашана ў выглядзе пілонаў з вастраверхімі шатрамі, падобнымі да вежаў.

У 1928 г. у вёсцы Дайлідкі быў пабудаваны драўляны касцёл у гонар Апекі Маці Божай, які мае рысы драўлянага дойлідства Прыкарпацця, так званага «закапаньскага» стылю, характэрнага для часоў 2-й Рэчы Паспалітай. Асноўны прамавугольны зруб з высокім двухсхільным дахам з трох бакоў абкружаны абхадной галерэяй, што надае збудаванню выгляд базылікі. Больш нізкі алтарны зруб накрыты вальмавым дахам. У аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі дамінуе магутная чацверыковая вежа, завершаная шатром і шматгранным фігурным купалком-«банькай». У выніку нахілу бакавых граняў вежа ўверсе моцна звужаецца, што аптычна надае ёй яшчэ большую вышыню і стромкасць. Уваход вылучаны невялікім вастраверхім франтонам. У інтэр'еры святыні тры алтары: Апекі Маці Божай, св. Тэрэзы і св. Юзафа.

Падобную стылістыку мае касцёл св. Андрэя Баболі, пабудаваны ў 1938 г. у вёсцы Градаўшчызна. Асноўны прамавугольны і пяціграннi алтарны зрубы накрыты агульным двухсхільным дахам з вальмамі

і сігнатуркай над алтарнай часткай. Галоўны фасад завершаны трохвугольным франтонам і двух’яруснай чацверыковай вежай з шатровым пакрыццем. На тымпане франтона ў лучковай арачнай нішы-табэрнакулюме размешчана скульптурная выява Панны Марыі. Бабінец аформлены арачным уваходам. Уздоўж бакавых фасадаў асноўнага аб’ёма ідуць адкрытыя галерэі на слупах. Інтэр’ер перакрыты плоскай падшыўной столлю. Сцены ўнутры аздоблены дэкаратыўнай ашалёўкай. Над уваходам – галерэя музычных хораў. Падоўжную ўнутраную прастору святыні замыкае разьбяны алтар у выглядзе трыумфальнай аркі.

У вёсцы Гіры, на могілках, у першай палове XIX ст. была пабудавана невялікая драўляная капліца, архітэктура якой мае рысы класіцызму. Прамавугольны зруб з чатырохслуповым порцікам на галоўным фасадзе накрыты пакатым двухсхільным дахам. У цэнтры трохвугольнага франтона, гарызантальна ашаляванага дошкамі, размешчана скульптурнае «Укрыжаванне», што падкрэслівае строгую сіметрыю і сакральную сутнасць збудавання. Яшчэ адна невялікая капліца змуравана ў канцы XX ст. каля Быстрыцкай жыватворнай крыніцы. Прамавугольны аб’ём з пілонамі на вуглах накрыты двухсхільным дахам з заломам. Галоўны фасад завершаны прыступчатым шчытом і аформлены вялікім паўцыркульным арачным уваходам.

Архітэктурная спадчына Астравецкага раёна багатая і разнастайная. Да стварэння тут выдатных помнікаў дойлідства – храмаў і палацаў – далучыліся са старажытнасці вялікія князі ВКЛ, віленскае біскупства, пазней – буйныя мясцовыя магнацкія і шляхецкія роды Бжастоўскіх, Абрамовічаў, Котвічаў і інш. На жаль, разам з імі адышлі ў нябыт і многія набыткі культуры Астравеччыны, асабліва ў 20 ст., адзначаным шматлікімі і складанымі ваеннымі і палітычнымі падзеямі. Тое, што засталося, патрабуе ашчаднага да сябе стаўлення і аховы, таму што помнікі дойлідства – гэта яскравыя сведкі айчыннай гісторыі, увасабленне таленту беларускага народа, сапраўдныя рубяжы нашай гістарычнай памяці, за якія адступаць нельга. Гэта наша бязмернае багацце, непаўторная спадчына, якую мы павінны вывучаць, ведаць і шанаваць.

ЛІТАРАТУРА

1. Куляха, А. OCD Абраз Маці Божай у Гудагаі / А. Куляха. – Мінск : Pro Christo, 2007.
2. Харэўскі, С.В. Культавая архітэктура Заходняй Беларусі / С.В. Харэўскі // Искусство и культура. – 2012. – № 3(7). –18 с.
3. Памяць. Астравецкі раён. – Мінск : Белар. энцыкл., 2004. – 480 с..
4. Гісторыя вёсак і мястэчак Астравеччыны [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://astraviec.org/cms/index.-php?option=com.
5. Калаліцкія храмы на Беларусі. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2000. – 20 с.
6. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі (Гродзенская вобласць). – Мінск : Белар. сов. энцыкл. імя Пятруся Броўкі, 1986.

**УДК 375.85:659.111.314**

## РОЛЬ БРЕНДИНГА В ФОРМИРОВАНИИ ТУРИСТИЧЕСКОЙ ПРИВЛЕКАТЕЛЬНОСТИ РЕГИОНА

***О.В. ШТЕЕР***
***(Представлено: канд. пед. наук, доц. Н.И. АНТИПИН)***

*Тема брендинга – сегодня одна из самых актуальных. Это не просто мода и даже не желание выделиться, это конкуренция. Сегодня туристический брендинг – это кульминация широкого спектра направлений деятельности. Он позволяет создать имидж, который передает весь набор сигналов потребителю о качестве, цене, ожидаемые уровни качества товаров, услуг, фирм и территорий.*

Современное социально-экономическое развитие общества обуславливает острую проблему привлечения туристов в ту или иную страну. Сегодня для того, чтобы страна могла обойти конкурентов и стать объектом на рынке туристических услуг, её необходимо воспользоваться трендовым инструментом, который в последнее время является основным элементом маркетинговой политики многих стран, а именно создать собственный туристический бренд.

Цель данной работы – изучить роль брендинга в формировании туристической привлекательности региона.

Основная часть работы посвящена изучению сущности понятий «бренд», «брендинг» и «бренд территории».